ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

# РАШЭННЕ
## аб зніжэнні гендарнай квоты для выбарчага суб'екта "Рух Воля"

№ 03/31-1

31 сакавіка 2026 года г. Варшава

Выбарчая камісія ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Яраслава Бекіша, Алены Жылачкінай, Пятра Маркелава і Дзмітрыя Фурманава, разглядзеўшы звесткі, пададзеныя 30 сакавіка 2026 года прадстаўніком выбарчага суб'екта "Рух Воля" Мікітам Забугам для яго рэгістрацыі і ўдзелу ў выбарах у Каардынацыйную раду IV склікання, а таксама дасланае 30 сакавіка 2026 года абгрунтаванне зніжэння гендарнай квоты, прыйшла да наступных высноваў:

Згодна з дасланым абгрунтаваннем усе 28 кандыдатаў спіса выбарчага суб'екта "Рух Воля" маюць непасрэднае або ўскоснае дачыненне да мілітарнай дзейнасці, у якой адносная колькасць жанчын меншая за мужчын у некалькі разоў. З гэтай прычыны забеспячэнне гендарнага баланса для ўдзелу ў выбарчай кампаніі (не менш 40% асобаў менш прадстаўленага полу) з'яўляецца празмерна цяжкай задачай і стварае істотныя перашкоды для рэалізацыі палітычных правоў кандыдатаў выбарчага суб'екта.

Прадстаўнік выбарчага суб'екта адзначыў, што рэалізацыя палітычнай праграм, дасланай на адрас Камісіі, таксама патрабуе спецыялістаў у пытаннях абароны і бяспекі, дзе колькасць жанчын таксама ў разы меншая за мужчын.

Праверыўшы дасланыя звесткі, Камісія прыходзіць да высновы пра слушнасць сцвярджэнняў выбарчага суб'екта "Рух Воля" і прымае аргументацыю пра магчымасць зніжэння гендарнай квоты да 20% асобаў менш прадстаўленага полу.

З улікам вышэй выкладзенага, кіруючыся пп. 3.2.4. п. 3 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду, Выбарчай камісіяй

## ВЫРАШАНА:

Знізіць гендарную квоту для выбарчага суб'екта "Рух Воля" да 20%.

**Старшыня Выбарчай Камісіі** **Алена Прыходзька**